УДК 94(476)

# ХРЫСЦІЯНІЗАЦЫЯ БЕЛАРУСКІХ ЗЯМЕЛЬ: УПЛЫЎ НА КУЛЬТУРУ, ЗМЕНЫ Ў ВЫХАВАЎЧА-АДУКАЦЫЙНЫМ ПРАЦЭСЕ

***Віктар Пілецкі***
*Мінск, Беларусь*

На падставе гістарычных крыніц і літаратуры зроблены крытычны агляд працэсу хрысціянізацыі насельніцтва беларускіх зямель. Паказана спецыфіка хрышчэння насельнікаў тэрыторыі Беларусі ў параўнанні з іншымі землямі ўсходнееўрапейскага рэгіёну. Падкрэслены негвалтоўны спосаб распаўсюджання, спецыфічныя часавыя параметры, працягласць двухвер’я, вытокі і накіраванасць хрысціянізацыі ды іншыя асаблівасці названага працэсу. Прааналізаваны характэрныя рысы ўплыву хрысціянізацыі на культуру тагачаснага грамадства беларускіх зямель. Паказаны пераход ад дахрысціянскіх форм перадачы грамадскага вопыту новым пакаленням грамадзян, да новай школьна-пісьмовай выхаваўча-адукацыйнай парадыгмы.

***Ключавыя словы: Хрысціянізацыя, выхаваўча-адукацыйны працэс, язычніцтва, касмапалітызм, сінкрэтызм, рэлігія, гіпотэза, школа вучэння кніжнага, прародацэнтрычны прынцып, кніжнікі, епархія, царква.***

Адной з самых вызначальных падзей гісторыі Беларусі эпохі першых дзяржаў IX–XIII ст., якая карэнным чынам паўплывала на жыццё насельніцтва, было ўсталяванне хрысціянства. Да канца X ст. жыхары Беларусі былі язычнікамі. Славянскія супольнасці (крывічы, дрыгавічы і радзімічы) якія рассяліліся ў VI – VIII стст. пад уплывам т.зв. “вялікага перасялення народаў” па тэрыторыі Беларусі і перамяшаліся з аўтахтонным паганскім насельніцтвам балтамі (што і дало пачатак станаўленню беларускага этнасу) – таксама вызнавалі язычніцкую рэлігію. Аднолькавасць веравызнання збліжала іх і паслужыла адной з прычын з'яўлення прадзяржаўных утварэнняў з поліэтнічным балта-славянскім насельніцтвам – Полацкага, Тураўскага і Смаленскага княстваў, якія месціліся на тэрыторыі будучага этнічнага рассялення беларусаў.

На тэрыторыі Еўропы язычніцтва панавала да пачатку нашай эры. У 1 ст. н.э. ва ўсходніх правінцыях Рымскай імперыі з’явілася хрысціянства. Пачаткова гэта была рэлігія прыгнечаных членаў «іудзейскай секты», якія шукалі збаўлення ад цяжкіх (нечалавечных) умоў жыцця ў прыходзе месіі (збавіцеля). Хрысціянская ідэя абяцала пакутным і абяздоленым атрыманне шчасця і свабоды ў нябесным царстве. З цягам часу, хрысціянства, у выніку змен, што адбываліся ў ім самім і ў навакольным свеце, ператварылася са зняважанай і гнанай «іудзейскай секты» ў дзяржаўную рэлігію Рымскай імперыі (пач. 4 ст.). Міланскі эдыкт 313 г. імператараў Канстанціна і Ліцынія, зацвердзіў гэты статус [1, с.89]. Адносна хуткаму распаўсюджанню хрысціянства сярод розных сацыяльных і этнічных груповак імперыі спрыялі яго касмапалітызм (*ідэалогія т.зв. сусветнага грамадзянства*), місіянерская дзейнасць, універсалізм (*агульная запатрабаванасць*) маральных прынцыпаў, нівеліроўка (*згладжванне*) класавых і нацыянальных адрозненняў.

Галоўнае ў хрысціянстве – вучэнне пра богачалавека Ісуса Хрыста – Сына Божага, які сышоў з неба на зямлю, прыняў пакуты і смерць для збавення людзей ад першароднага граху, уваскрэс і ўзнёсся на неба. У будучым, паводле хрысціянскага вучэння, адбудзецца другое прышэсце Хрыста для суда над жывымі і мёртвымі. Прыхільнікі хрысціянства павінны выконваць запаветы Хрыста, пакорліва пераносіць цяжкасці жыцця, як гэта рабіў Хрыстос, а падзяку за гэта яны атрымаюць у замагільным свеце.

Працэс замены язычніцтва монатэістычнымі (адзінабожнымі) рэлігіямі (т.як: *будызм, іслам і хрысціянства*) меў сусветны харатар. Пачынаючы з 4 ст. н.э. яны паступова выцяснялі і пераадольвалі язычніцтва. Найбольш магутным сярод іх было хрысціянства.

ПолесГУ

Еўропа перажыла два этапы хрысціянізацыі. Першы пачаўся з узнікнення хрысціянства – да VII–VIII стст., калі была ахрышчана Рымска-Візантыйская імперыя, імперыя франкаў і брытанскія каралеўствы. А падчас другога этапу ў IX–X стст., Хрыстову веру прынялі славянскія дзяржавы і Скандынавія.

Асаблівасцю перыяду прыняцця хрысціянства было тое, што практычна ўсюды яно супадала з утварэннем самастойных монаэтнічных дзяржаў. У хрысціянстве былі зацікаўлены адзінаўладныя кіраўнікі дзяржаў (князі, каралі, цары). Прынцып: – "адзін Бог на небе – адзін князь /*цар, кароль, ці інш.*/ на зямлі" – моцна падтрымліваў адзінаўладдзе (манархізм у кіраванні), што вяло да паспяховага станаўлення хрысціянства ў якасці "дзяржаўнай" рэлігіі.

Першыя звесткі аб пранікненні на тэрыторыю Усходняй Еўропы хрысціянскай веры па візантыйскім узоры (праваслаўя) адносяцца да IX ст. Лічыцца, што хрысціянкай была кіеўская княгіня Вольга (945–957). Не выключана, што хрысціянкай была і правіцельніца Полацка – Прадслава, якую лічаць маці князёў Рагвалода і Тура (сучасніца Вольгі), якая ўпамінаецца ў дагаворы з Візантыяй, заключаным кіеўскім князем Ігарам у 945 г. (пасол Каніцар, ад Праславы, упамінаецца ў якасці ўдзельніка перагавораў) [2, с.23]. Хрысціянкай відаць была і полацкая князёўна Рагнеда (дачка Рагвалода), якая адмовілася (у 980-х гадах) стаць другой жонкай язычніку Уладзіміру. У канцы X ст. (988 г.), кіеўскі князь Уладзімір прыняў хрысціянскую веру па візантыйскім (праваслаўным) узоры і ахрысціў падпарадкаваную яму дзяржаву Кіеўскую Русь.

Што тычыцца Полацкага княства, якое было першай дзяржавай на тэрыторыі Беларусі, то афіцыйнай на сённяшні дзень, датай прыняцця хрысціянства на беларускіх землях, лічыцца 992 г. – час калі была заснавана Полацкая епархія прыхільнікаў усходнехрысціянскага (праваслаўнага) абраду. Гэтую ж дату лічыць сапраўднай і дзеючая сёння ў Беларусі, Руская праваслаўная царква (РПЦ).

Тым не менш, канкрэтнай, навукова абаснаванай даты хрысціянізацыі насельніцтва тэрыторыі Беларусі, на сённяшні дзень усё ж не існуе. Некаторыя гісторыкі, у значанай ступені навукова абаснавана, лічаць, што з'яўленне хрысціянства ў Полаччыне на тэрыторыі Беларусі, адбылося ў той жа час што і ў Кіеўскай Русі, а можа нават і крыху раней. Прычым хрысціянства прыйшло ў Полацк (таксама як і ў Кіеў) напрамую з Візантыі. Полацкае княства, у той час, было незалежнай дзяржавай і падтрымлівала прамыя сувязі са сталіцай Імперыі (Канстанцінопалем), аб чым ёсць сведчанні гістарычных крыніц. Адно з іх напрыклад: сустрэча Еўфрасінні Полацкай з імператарам Мануілам Комнінам, які ішоў на вайну з венграмі, але нягледзячы на важныя справы асабіста прыняў знакамітую паломніцу, а потым накіраваў яе "з вялікай пашанай ў Царгорад" [3, с.290].

Беларускі гісторык Сяргей Тарасаў глыбока вывучыўшы праблему хрысціянізацыі звярнуў увагу на тое, што факт хрышчэння насельніцтва Беларусі, відавочна адрозніваецца ад працэсу хрышчэння іншых зямель тагачаснай Усходняй Еўропы – такіх як Кіеўшчына, Наўгародчына і інш. Па-першае, на гэта звяртае ўвагу той факт, што хрышчэнне Полаччыны нідзе не адлюстравана ў гістарычных крыніцах. Пра яго не сказана, ні ў летапісах, ні ў хроніках, ці іншых гістарычных дакументах. Пра тое як Уладзімір хрысціў Кіеў, Ноўгарад, і інш. землі Кіеўскай Русі сказана вельмі падрабязна, а пра хрышчэнне Полацкага княства зусім аніякай інфармацыі.

Ці мог летапісец "забыць" ці "не заўважыць" як адбываўся працэс хрысціянізацыі беларускай першадзяржавы? Канешне ж не. Летапісцы былі спецыяльна прызначанымі кіраўніком краіны людзьмі якія асвятлялі важныя падзеі ў жыцці дзяржавы. Тады чаму зусім адсутнічае інфармацыя пра хрышчэнне Полацкага княства?

Беларускія даследчыкі (гісторык С.Тарасаў і пісьменнік У.Арлоў [4, с.8–11]) адказваюць на гэтае пытанне так: "пра хрышчэнне Полацка не сказана ў летапісах, таму, што адначасовага акта хрышчэння проста не было". Спецыфіка хрышчэння беларускіх зямель была ў тым, што тут адбывалася працяглае па часе (з IX – па XIV ст.) "мірнае ўрастанне хрысціянства ў язычніцкае асяроддзе". На працягу гэтага часу ў духоўнай культуры насельніцтва Беларусі існавала спецыфічная з'ява "двухвер'е" (*сінкрэтызм*).

Падчас яе афіцыйна дзейнічала хрысціянства (яго прыхільнікамі былі кіруючыя колы дзяржавы). У той жа час у народным асяроддзі, неафіцыйна, панавалі язычнікія вераванні. Спецыялісты гісторыкі сведчаць наяўнасць язычніцкіх вераванняў на тэрыторыі Беларусі ажно да канца XIX ст. [5], а асобныя з іх, як вядома, дайшлі і да нашых дзён.

Сутнасць "гіпотэзы" С.Тарасава [6]:

1) хрысціянства прыйшло на Полаччыну можа нават раней чым у Кіеў... (даказваецца верагодным знаёмствам полацкага князя Рагвалода і яго дачкі Рагнеды з хрысціянствам, яшчэ да афіцыйнага хрышчэння Кіева ў 988 годзе);

2) кіеўскія князі не ажыццяўлялі хрышчэнне беларускіх зямель (і не маглі гэтага зрабіць), бо Полацк на той час быў самастойным дзяржаўным утварэннем, якое супернічала з Кіевам і Ноўгарадам (аб чым сказана ў "Аповесці мінулых гадоў");

3) хрысціянства прыйшло ў Полацк напрамую з Візантыі (без пасрэдніцтва Кіева)...;

4) хрысціянізацыя беларускіх зямель (у адрозненне ад Кіеўскай Русі, (Кіева, Ноўгарада і інш), ішла негвалтоўным шляхам, а шляхам (*далей цытата С. Тарасава*: – *В.П.*) "...мірнага ўрастання хрысціянства ў язычніцкае асяроддзе, і ахапіла вельмі працяглы перыяд, ажно да XIV–XV стст. ...";

5) (*цытата С. Тарасава*: – *В.П.*) хрысціянізацыя тэрыторый Беларусі "...ажыццяўлялася па схеме: князь – дружына – горад – вёска...";

6) (*гэта палажэнне "гіпотэзы" толькі абазначана ў працах С.Тарасава, а сфармулявана канчаткова пісменнікам У. Арловым – В.П.*) ... хрысціянства прыйшло на тэрыторыю Беларусі яшчэ да падзелу (усяленскай царквы) на каталіцтва і праваслаўе (якое, як вядома, адбылося ў 1054 г.), а гэта значыць, што беларускія землі не з'яўляюцца "исконно" праваслаўнымі (як заяўлялі ў царска-расійскай, буржуазнай і савецкай гістарыяграфіі).

Каталіцтва вядома тут (на тэрыторыі Беларусі) з пачатку XI ст., з часоў жаніцьбы тураўскага князя Святаполка Яраполкавіча, якая адбылася не задоўга да смерці (у 1015 г.) князя Уладзіміра Святаславіча (хрысціцеля Кіеўскай Русі). Разам з нявестай, дачкой польскага князя Баляслава Харобрага, у Тураў прыехаў епіскап Рэйнбер, які распачаў тут справу акаталічвання, што не спадабалася Уладзіміру [7, с.52].

Інакш кажучы, робіць выснову У.Арлоў, хрысціянства прыйшло на тэрыторыю Беларусі да 1054 г (г.зн. задоўга да даты афіцыйнага падзелу на каталіцтва і праваслаўе ў Еўропе). Прычым – прыйшло як з Візантыі, так і з рымска-польскага Захаду, адначасова. А таму, пра Беларусь, трэба гаварыць як пра краіну дзе і праваслаўе і каталіцызм маюць аднолькава даўнія гістарычныя карані [4].

Увогуле на тэрыторыю Беларусі хрысціянства, відаць пачало пранікаць у IX ст. Ужо ў X ст. ісландская епіскапская "Сага аб хрышчэнні" распавядае пра місіянера Торвальда, па прозвішчы Вандроўнік, які, прайшоўшы паломніцкі шлях у Палесціну, вяртаўся да сябе на радзіму праз Полаччыну. У Полацку, паводле звестак, ён заснаваў манастыр у гонар Іаана Прадцечы, дзе памёр і быў пахаваны. Наяўнасць манастыра ў Полацку, як вядома, пераканаўчае сведчанне таго, што тут былі і мясцовыя веруючыя людзі – (палачане) манахі. А гэта значыць, што хрысціянства, яшчэ за-доўга да хрышчэння Кіева – было вядома на тэрыторыі Беларусі. Пісьмовыя крыніцы XV ст. сапраўды фіксуюць у Полацку такі манастыр. Можна спадзявацца, што ў хуткім часе будуць знойдзены і яго археалагічныя рэшткі.

Не выключана і тое, што да часу афіцыйнага прыняцця новай рэлігіі з верай былі знаёмы і Рагвалод, і Рагнеда. Інакш цяжка вытлумачыць пастрыжэнне Рагнеды ў манашкі пад імем Анастасіі і заснаванне ёю манастыра ў Заслаўі. Прыхільна ставіўся да хрысціянства сын Рагнеды – князь Ізяслаў (988–1001). Летапісы згадваюць яго як першага князя-кніжніка, які "любіў і шанаваў манашы чын". Па меркаванні шэрагу даследчыкаў, працэс распаўсюджання новай веры ў нашай краіне быў досыць мірны, але і больш працяглы па часе (да XIV ст.), а адзінкавыя астраўкі паганства захаваліся ажно да XIX – XX ст.

Толькі аб Тураве ў сувязі з прыняццем хрысціянства згадваецца паданне аб чырвонай ад крыві Прыпяці і каменных крыжах, якія плылі па яе водах (што відаць сведчыць пра прымусовае ўвядзенне хрысціянства ў гэтай прабеларускай першадзяржаве, па прыкладзе Кіеўскага княства).

Поспех у распаўсюджванні хрысціянства залежаў пэўным чынам і ад мудрай тактыкі першых хрысціянскіх святароў (у асноўным выхадцаў са славянскай Балгарыі). Яны, як вядома, паўсюдна прыстасоўвалі (прывязвалі) даты шырока вядомых у народзе язычніцкіх святаў і абрадаў з новымі хрысціянскімі святамі. Што, на думку даследчыкаў, значна паспрыяла больш хуткаму распаўсюджанню новай веры (Вялікдзень – Пасха, Сёмуха – Тройца, Купалле – свята Іаана Хрысціцеля (Ян, Іван Купала), збор жыта – Спас, Восеньскія Дзяды – ушанаванне Дзмітрыя Салунскага, Каляды – Нараджэнне Хрыстова і інш.).

Важным, у разуменні спецыфікі хрысціянізацыі Беларусі, з’яўляецца тэрмін “двухвер’е” (дваяверства). Ён азначае адначасовае суіснаванне (сінкрэтызм) на пэўнай тэрыторыі элементаў паганства і хрысціянства, што было характэрна для Беларусі. На беларускіх землях хрысціянства пераважала сярод гарадского насельніцтва, і значна больш марудна гэты працэс праходзіў на вёсцы. Прамых звестак пра хрышчэнне Беларусі няма. Такія падзеі, як у Кіеве і Ноўгарадзе (знішчэнне язычніцкіх багоў, прымусовае прывядзенне кіеўлян на Дняпро і крывавая бойка ў Ноўгарадзе), абмінулі нашы землі. Магчыма, гэтаму спрыяла тое, што беларускія князі праводзілі самастойную палітыку не толькі ў дзяржаўнай, але і ў духоўнай сферы. Ёсць меркаванне, што першыя епіскапы былі дасланы ў Кіеў, Ноўгарад і Полацк з балгарскай Ахрыдскай аўтакефальнай царквы. Яна была царквой праваслаўнага кірунку, у статусе патрыярхату, і роўнай з візантыйскай Канстанцінопальскай царквой.

Распаўсюджванне хрысціянскай ідэалогіі на тэрыторыі рассялення беларускага этнасу прывяло за значных *змен у культуры*. Традыцыйна-язычніцкія вераванні і абраднасць, якія існавалі з глыбокай старажытнасці, паступова пачалі змяняцца хрысціянска-ідэалагічнымі каштоўнасцямі. Для паганскага тыпу культуры быў характэрны прырода-цэнтрысцкі тып культуры. Чалавек і прырода – адно цэлае. Прырода вучыць, карае, ратуе, а таксама дае жыццё. Праз раслінны і жывёльны свет чалавек веў дыялог з багамі. Ён не вылучаў сябе з прыроднага свету і не ўзносіў сябе над гэтым светам. Яго сэнс і мэты жыцця заставаліся на тым жа ўзроўні. Культура язычніцкага грамадства, апрача міфаў, уключала розныя віды абраднасці, фальклор і ўвесь комплекс дахрысціянскага светаразумення. У беларускай міфалогіі, як і ў міфалогіі любога іншага этнасу, існавалі свае касмаганічныя і антрапалагічныя міфы (Род, Жыва, Цёця), свой пантэон язычніцкіх багоў і іх іерархія (Пярун, Ярыла, Даждбог, Рада, Ляля, Лад, Кара, Жыцень і інш.).

Хрысціянства паставіла чалавека ў кантэкст грамадства, зрабіла яго аб'ектам і прадметам рэалізацыі свайго прызначэння і здольнасцей. З пераходам у хрысціянства карэнным чынам мяняўся сэнс жыцця. Хрысціянская ідэалогія сцвярджала: ...палюбі Бога свайго... палюбі бліжняга... спяшайся рабіць дабро... Іншымі словамі ... будзь карысным грамадству і, як узнагароду атрымаеш несмяротнасць душы, а таксама жыццё вечнае ў замагільным свеце. Хрысціянства, фактычна, нанава сфарміравала беларускую культуру, паставіла народ у кантэкст еўрапейскай цывілізацыі, дало хрысціянскую мараль і этыку, спрыяла развіццю пісьменства, літаратуры, тэалогіі, філасофіі, права, іканапісу, жывапісу, музыкі, мураванага дойлідства.

Калі казаць пра змены ў *выхаваўча-адукацыйным працэсе* звязаныя з хрысціянізацыяй, то нельга не адзначыць што гісторыя грамадства любой краіны гэта непарыўны працэс станаўлення новых пакаленняў людзей. Нараджэнне, засваенне культуры былога пакалення, стварэнне ўласнай, і перадача яе новаму пакаленню – такі парадак гістарычна-культурнай эвалюцыі чалавецтва. Выхаваўча-адукацыйны працэс, як адна са сфер жыццядзейнасці грамадства, на кожным этапе гісторыі насельніцтва тэрыторыі Беларусі дае магчымасць адсочваць гістарычна-прагрэсіўную эвалюцыю грамадства. І безумоўна, хрысціянізацыя, што ахапіла беларускія землі ў перыяд

ПолесГУ

зараджэння дзяржаўнасці, адлюстравалася і ў развіцці выхаваўча-адукацыйнага працэсу.

У перыяд X–XIII стст. у выхаваўча-адукацыйным працэсе Беларусі з'яўляецца новая (хрысціянская) форма падрыхтоўкі дзяцей. У летапісных крыніцах яна атрымала назву «*школа вучэння кніжнага*». Гэта былі ўсходнехрысціянскія (праваслаўныя) рэлігійна-ідэалагічныя школьна-палітычныя ўстановы. Важнейшай мэтай, якая ўскладвалася на іх царквой, была катэхізацыя (распаўсюджванне царкоўна-хрысціянскай дактрыны) у асяроддзі мясцовага насельніцтва. Школы арганізоўваліся феадальнымі, рэлігійнымі і свецкімі палітычнымі ўладамі, зацікаўленымі ў хрысціянізацыі жыхароў сваёй краіны, часцей за ўсё насуперак волі насельніцтва. Акрамя катэхізацыі, яны мелі мэту падрыхтоўкі ніжэйшага звяна царкоўна-ідэалагічнай іерархіі – прыходскіх святароў. Задачы стварэння вышэй названых устаноў былі наступныя: а) фарміраванне сацыяльнай базы царквы як апоры феадалізму ў асяроддзі мясцовага насельніцтва; б) распаўсюджванне ўсходнехрысціянскай (праваслаўнай) дактрыны; в) барацьба з язычніцтвам і традыцыйнымі формамі падрыхтоўкі падрастаючага пакалення, што дзейнічалі ў папярэдні перыяд.

На гэтым этапе, разам са «школамі вучэння кніжнага» у межах тэрыторыі Беларусі, яшчэ існавалі ранейшыя, традыцыйныя, дахрысціянска-язычніцкія формы перадачы вопыту. Перш за ўсё гэта былі агульнаабшчынныя «*лясныя*», ці «мужчынскія» *дамы*. Там арганізоўваўся комплекс перадініцыяцыйнай падрыхтоўкі падлеткаў (што ўключаў паведамленне ім важнейшых дасягненняў грамадства ў вытворча-здабытковай сферы і духоўна-абрадавай культуры), а таксама ажыццяўляліся ініцыяцыйна-экзаменацыйныя выпрабаванні моладзі.

Той хто прайшоў комплекс ініцыяцый, атрымліваў грамадскае прызнанне і права лічыцца дарослым чалавекам (з роўнымі, іншым прадстаўнікам грамадзянскімі правамі і абавязкамі). Калі малады чалавек не змог пацвердзіць ініцыяцыяй сваю дарослосць (па любой з прычын: хвароба, недаразвітасць арганізма і інш.) – ён на ўсё астатняе жыццё лічыўся непаўнавартасным (*рус*: неполноценным) чалавекам. Яму недазвалялася заводзіць сям'ю і нараджаць дзяцей. Ён быў абмежаваны ў грамадзянскіх правах. Да яго было адпаведнае стаўленне ў абшчыне і замацоўваўся статус неправамоцнага (неправаадказнага) чалавека.

Этымалогія выраза "*Іванушка – дурачок*", які вельмі часта сустракаецца ў народнай творчасці насельніцтва беларуска-руска-украінскага рэгіёна, відаць мае непасрэдную сувязь з фактам такога неправадказнага чалавека. Таго, які не змог даказаць грамадству сваю правадзейнасць і дарослосць. "*Іванушка*" – гэта пераростак. Чалавек хоць і дарослы (па гадах), але па справах – малалетні. Яго ніхто не слухае, да яго не адносяцца ўсур'ёз, і не даручаюць яму важных і адказных спраў. Ён іх, маўляў, усё роўна не зможа выканаць.

Разам з "мужчынскімі дамамі", што ўяўлялі сабой ("простанародную", агульнаабшчынную форму выхаваўча-адукацыйнага працэсу), існавалі і спецыфічна-прафесійныя *формы перадачы рамесніцкіх навыкаў* і ўменняў, а таксама *элітарна-прафесійныя*, для прадстаўнікоў прывіліяраваных саслоўяў. Дзейнічалі напрыклад, прывілегіраваныя ваенна-феадальныя формы выхавання і вучэльні (выхавальніцтва-аталыцтва, дамы-грыдніцы), жрэчаска-прафесійнае вучнёўства, а таксама вандроўныя вучыцельныя «людскія повстнікі» і кніжнікі, што ўпамінаюцца ў тэксце ахоўнай граматы (ярлыка), дадзенай ханам Залатой арды Узбекам мітрапаліту ўсяе Русі Пятру ў 1313 г.

Адносіны насельніцтва да «школ вучэння кніжнага», як новай незразумелай і небяспечнай для абшчыннага жыцця з'явы ў выхаванні і адукацыі, былі рэзка адмоўныя. Школа ўспрымалася як чужое і страшнае новаўвядзенне, здольнае разбурыць векавыя асновы мясцовага традыцыйнага грамадзянскага ўкладу. У старажытным летапісе "Аповесць мінулых гадоў" сказана што маці, па аддадзеных у школу дзецях плакалі як па мерцвяках: «…нача поимати … дети, и даяти … на ученье книжное. Матере же чадь сихъ плакахуся по нихъ … акы по мертвеци …» [2, с. 53].

І гэта не з'яўляецца метафарай летапісца. Па меркаванні тагачасных жыхароў Беларусі іх сыны сапраўды паміралі для жыцця і ранейшага ўкладу. Асабліва калі ўлічыць



Полесгу

тую велізарную разніцу (амаль прорву), што падзяляла гэтыя дзве культуры (новую хрысціянскую і былую язычніцкую).

Малады чалавек у выніку завяршэння хрысціянскай вучэльні станавіўся зусім іншым ідэалагічна. Гэта быў якасна іншы чалавек. У яго былі зусім іншыя жыццёвыя ўстаноўкі, маральныя прынцыпы, перакананні. Ён трапляў у зусім іншую светапоглядную сістэму. Калі, напрыклад, маладога чалавека бралі на вайну, то ён, пасля яе завяршэння (калі не загінуў), меў магчымасць вярнуцца і працягнуць свой род і племя абапіраючыся на сваю культуру і вусна-маральныя традыцыі сваіх прашчураў. Навучыўшыся ж пісьмовай хрысціянскай культуры і літаратуры, малады чалавек губляў сваю родаплемянную прыналежнасць і ніколі ў яе не вяртаўся. Таму навучанне ў «школе вучэння кніжнага» было падобна фізічнай пагібелі. Самавызначэнне па веравызнанню, у дадзеным выпадку, аказвалася больш значным і моцным чым самавызначэнне па крыві і роднасці.

Нягледзячы на боязь і супраціўленне насельніцтва хрысціянская граматнасць у Полацкай дзяржаве-княстве (і ў тураўска-смаленскім рэгіёне) на тэрыторыі Беларусі, таксама як і ў Кіеўскім княстве (на тэрыторыі Украіны), і ў Наўгародскай зямлі (на тэрыторыі сучаснай Расіі) развівалася, дзякуючы настойлівасці кіруючых феадальна-палітычных колаў, даволі інтэнсіўна. Вядома, напрыклад, што сын кіеўскага князя Яраслава Мудрага Усевалад, жывучы ў Кіеве вывучыў пяць замежных моў. Пра гэта сказана у "Павучанні Манамаха". Ён відаць ведаў грэцкую, лацінскую, польскую, шведскую і нарвежскую мовы. А сам Яраслаў Мудры, як вядома, быў сынам полацкай князёўны Рагнеды. Была пісьменнай і дачка Яраслава Мудрага Ганна (унучка Рагнеды), якая стала пазней каралевай Францыі, жонкай французскага караля Генрыха І. Захаваўся нават яе аўтограф якім яна падпісвалася будучы ўжо каралевай. Можна выказаць здагадку, што адукаванымі людзьмі былі і іншыя сыны Яраслава: Ізяслаў і Святаслаў Яраславічы, пра што сведчыць знакаміты «Ізборнік вялікага князя Святаслава». Доказы адукаванасці жыхароў Беларусі таксама ёсць [8, с. 120–122].

Такім чынам, хрысціянізацыя насельніцтва беларускіх зямель прывяла да значных змен у культуры і выхаваўча-адукацыйным працэсе тагачаснага грамадства. Найперш адбыліся светапоглядныя змены: замест прыродацэнтрычнага прынцыпу светаўспрымання рэчаіснасці, дзе краевугольным каменем грамадскага існавання (уключаючы кожнага асобнага чалавека), лічылася прырода (што карала, ратавала, давала і забірала жыццё) – прыйшоў хрысціянскі тып светаразумення. Пры ім чалавек быў пастаўлены ў кантэкст грамадскіх каштоўнасцей (неабходнасць любові да Бога і да людзей якія жывуць побач; патрэба "рабіць дабро" – ажыццяўляць учынкі, справаздача аб якіх будзе запатрабавана ў "замагільным свеце").

Змены ў культуры насельніцтва тэрыторыі Беларусі выявіліся таксама і ў з'яўленні новых накірункаў культурнага кантэксту: мураванага дойлідства, жывапісу, літаратуры…, што з'явіліся на тэрыторыі Беларусі дзякуючы кантактам з еўрапейскімі краінамі ў працэсе хрысціянізацыі.

Важныя змены адбыліся і ў выхаваўча-адукацыйным працэсе. Замест традыцыйных дахрысціянска-язычніцкіх форм перадачы грамадскага вопыту падрастаючым пакаленням ("лясныя дамы", ініцыяцыі...), прыйшоў новы спосаб выхавання дзяцей заснаваны на хрысціянскім веравучэнні. З'явіліся так званыя "школы вучэння кніжнага" пра якія сведчаць летапісныя крыніцы.

На пачатковым этапе ўзаемаадносінам язычніцтва і хрысціянства было характэрна двухвер'е і ўзаемапранікненне (сінкрэтызм). Таму некаторы час дахрысціянскія формы яшчэ захоўвалі сваю актуальнасць (асабліва ў асяроддзі вясковага насельніцтва) і было часовае іх суіснаванне са школамі. Але пазней, пад націскам кіруючых колаў тагачасных дзяржаў што стымулявалі працэс хрысціянізацыі, а таксама ў выніку надзвычай інтэнсіўнага грамадскага прагрэсу заснаванага на кніжна-пісьмовай культуры (судова-заканадаўчая сфера, летапісанне, літаратура, пашырэнне колькасці навучальных устаноў ды інш.), язычніцкія формы перадачы грамадскага вопыту дзецям сышлі з гістарычна

арэны і перапынілі сваё існаванне. Школа паступова, заняла месца асноўнай формы выхаваўча-адукацыйнага працэсу.


1. История Европы. / Ж. Альдебер, Й. Бендер, И. Груша // Пер. с фр. М.П. Дешевицына, Научн. ред. В.С. Кошелев. – Минск: Вышэйшая школа; М.: Просвещение. 1996. – 384 с.
2. Повесть временных лет /Подг. текста, перевод, статьи и коммент. Д.С. Лихачева. / Под ред. В.П. Адриановой-Перетц. 3-е изд. – Спб.: "Наука" РАН, 2007. – 668 с.
3. Аповесць жыцця і смерці святой і блажэннай і найпадобнейшай Еўфрасінні, ігуменні манастыра святога Спаса і Найсвяцейшай Ягонай Маці, што ў горадзе Полацку. Багаславі Ойча // Жыватворны сімвал Бацькаўшчыны – Животворный символ Отчизны /Аўт.-уклад. У.А. Арлоў; пер. на рус. У. Арлоў – Мінск: "Асар", 1998. – 328 с.
4. Арлоў, У.А. Як хрысцілася Полацкае княства // Арлоў У.А. Еўфрасіння Полацкая / У.А. Арлоў. – Мінск: Мастацкая літаратура. 1992. – 220 с.
5. Богданович, А.Е. Пережитки древнего миросозерцания у белорусов / А.Е. Богданович. Этнографический очерк. – Гродно: Губернаская типография. 1895. – 186 с.
6. Тарасаў С.В. Хрышчэнне Полацкай зямлі // Спадчына 1990, №3. С.44–46; Тарасаў С.В. Адкуль прыйшло хрысціянства на Беларусь? // З гісторыяй на «Вы». Публіцыстычныя артыкулы. Выпуск 2. Мн., 1994. С.75–89.
7. Титмар Мерзебургский, Хроника. В 8 книгах / 2-е изд., исправл. / Перевод с лат. И.В.Дьяконова. М., «Русская панорама», 2009. // Серия «MEDIÆVALIA: средневековые литературные памятники и источники» [Электронный ресурс]. – 2018. – Режим доступа: https://knigogid.ru/books/818818-titmar-merzeburgskiy-hronika/toread. – Дата доступа: 22.09.2018 – Время доступа: 13.31. (гл.: с.52: https://knigogid.ru/books/818818-titmar-merzeburgskiy-hronika/toread/page-52).
8. Пілецкі, В.А. Да пытання пра адукаванасць грамадства беларускіх зямель у перыяд першых дзяржаў-княстваў IX–XIII стагоддзяў / В.А. Пілецкі // Управление в социальных и экономических системах: м-лы XXVII международной научно-практической конференции, г. Минск, 18 мая 2017 г. / редкол.: Н.В. Суша (предс.) и др.; Минский инновационный ун-т. – Минск: Минский инновационный университет, 2018. – 152 с.


ПолесГУ